Такім чынам, на працягу XX ст. у гісторыі Расійскай Імперыі, Савецкага Саюза, у тым ліку і Беларусі, пераважалі аўтарытарныя метады кіравання. Хвалі ліберальна-дэмакратычнага развіцця, звязаныя ў беларускім грамадстве з нашаніўскім перыядам, ажыццяўленнем палітыкі беларусізацыі ў 1920-х гг., з першай палітычнай «адлігай» і падзеямі канца мінулага стагоддзя, хаця і ўнеслі пэўныя змены ў грамадскае жыццё, але не сталі вырашальнымі. Адлік гэтых хваль у XX ст. можна весці ад Маніфеста 17 кастрычніка 1905 г.

*Бібліяграфічныя спасылкі*


1. Маркс, К. К критике политической экономии / К. Маркс // Сочинения / К. Маркс, Ф. Энгельс. 2-е изд. М. : Гос. изд-во полит. лит., 1959. Т. 13.
2. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал. : М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск : Экаперспектыва, 2000–2005. Т. 4 : Беларусь у складзе Расійскай Імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / М. Біч [і інш.]. 2005.
3. История Беларуси в документах и материалах. Минск, 2000.
4. Минский курьер. 2005. 28 окт.


© Касцюк М.П., 2007

*М.М. Забаўскі*

## ДЗЯРЖАЎНАЯ ДУМА РАСІІ Ў ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫМ ЖЫЦЦІ БЕЛАРУСІ (1906–1917 гг.)

Пачатак XX ст. быў часам карэнных змен у Расійскай Імперыі. На палітычнай арэне пачалі дзейнічаць манархічныя (урадавыя), ліберальныя і сацыял-дэмакратычныя партыі і групы. Яны мелі ўласныя канцэпцыі шляхоў развіцця краіны, сваё бачанне сродкаў дасягнення абвешчаных імі ідэалаў. Большасць з партый пры падтрымцы пэўных сацыяльных груп імкнуліся выкарыстаць Дзяржаўную думу для прапаганды і рэалізацыі сваіх праграмных палажэнняў. Гэта было магчыма толькі пры ўмове правядзення максімальнай колькасці сваіх дэпутатаў у Думу. Менавіта гэта акалічнасць надавала своеасаблівасць і вастрыню выбарчым кампаніям. Іх аналіз мае выключную важнасць, паколькі дазваляе грунтоўна разгледзець размеркаванне палітычных сіл па губернях і рэгіёнах, вызначыць спецыфіку іх дзейнасці і ўзровень папулярнасці, адносіны з мясцовымі ўладамі. Урадавая палітыка ў заходніх губернях садзейнічала стварэнню тут спецыфічных умоў для правядзення выбараў. На іх фоне, як у люстэрку, адбіліся абставіны, у якіх на працягу другой паловы XIX – пачатку XX ст. развівалася беларуская культура, мова.

Праблемы расійскага парламентарызму [illegible] даследаваліся яшчэ ў дакастрычніцкі перыяд. Толькі з моманту склікання Думы да 1 ліпеня 1912 г. было надрукавана каля 125 прац, у назвах якіх упаміналася Дзяржаўная дума. У працах В.І. Гер'е, В.Д. Набокава, А.І. Камінкі, Т.В. Локаця на даволі шырокай базе крыніц быў апісаны змест законапраектаў, якія выносіліся на разгляд Думы, і адносіны да іх думскіх фракцый. В.А. Абрамсон, Ф.І. Дан, П.М. Мілюкоў, К.І. Трусевіч разглядалі законы аб выбарах у Думу як форму палітычнай барацьбы. Г.Г. Замыслоўскі, А.А. Смірноў, А.А. Лукашэвіч, Я.І. Дземчанка, А.А. Майкоў ды іншыя паказвалі дзейнасць у сталіцы і рэгіёнах манархічных саюзаў, партый і груп. Большасць жа даследаванняў у вылучаны перыяд былі напісаны кадэтамі М.М. Вінаверам, Ф.А. Галавіным, А.Г. Зурабавым, А.С. Ізгоевым, Л.М. Ніселовічам, М.В. Раманавым і эсэрамі А.І. Спірыдовічам, А.М. Савіным, С.Л. Маславым ды іншымі ці прысвячаліся іх дзейнасці. Друкаваліся зборнікі і кароткія біяграфіі дэпутатаў Расійскага парламента.

У 1960-х гг. выйшла ў свет манаграфія С.М. Сідзельнікава, прысвечаная І Дзяржаўнай думе. Упершыню ў савецкі час аўтар высвятляў характар эвалюцыі палітычных устаноў Расіі ў пачатку XX ст., аналізаваў ход выбарчай кампаніі і дзейнасць Думы ў цэлым. Я.Д. Чарменскі і Ф.І. Калінычаў ўжо не абмяжоўваліся толькі асобнымі эпізодамі аб класавых супярэчнасцях у Думе і значна пашырылі базу крыніц.

Неабходна асабліва вылучыць работы А.Я. Аўрэха, які ў шматлікіх публікацыях у навуковых часопісах, манаграфіях разглядаў шырокае кола пытанняў, звязаных з выбарамі і дзейнасцю III і IV Думы. Менавіта яму належаць першыя даследаванні аб увядзенні земства ў заходніх губернях.

Пастаянным апанентам А.Я. Аўрэха выступаў В.С. Дзякін. Ён аналізаваў пазіцыі ліберальных партый і асаблівую ўвагу надаваў іх адносінам да праблем рэформ і рэвалюцыі. Думскай праблеме была прысвечана праца М.А. Марцуховай.

Вялікі ўклад у распрацоўку пытанняў, звязаных з выбарамі і функцыянаваннем І і ІІ Дзяржаўнай думы, характарыстыкай дэпутацкага корпуса ад пяці заходніх губерняў, аналізам урадавай палітыкі ў Беларусі, палітычнай сітуацыі ў трэцячэрвеньскі перыяд, месца і ролі газеты «Наша ніва», адносін да Думы беларускага сялянства ўнёс М.В. Біч. Упершыню ў беларускай гістарыяграфіі да комплекснага разгляду становішча і дзейнасці польскіх памешчыцка-клерыкальных груповак у беларуска-літоўскіх губернях у другой палове XIX – пачатку XX ст. прыступіў А.Ф. Смалянчук. Па гэтай праблеме ім абаронена

кандыдацкая дысертацыя «Польскі нацыянальны рух на Беларусі і ў Літве напярэдадні і ў перыяд рэвалюцыі 1905–1907 гг.» і доктарская дысертацыя «Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях (1864 – люты 1917 г.)».

Гістарычнаму перыяду, у які існавала Дума, прысвяцілі свае працы беларускія гісторыкі І.В. Аржахоўскі, Х.Ю. Бейлькін, М.Ф. Болбас, А.І. Бухавец, М.В. Доўнар-Запольскі, Д.А. Дудкоў, А.П. Жытко, А.С. Кароль, А.Г. Каханоўскі, К.І. Кернажыцкі, Л.П. Ліпінскі, Л.М. Лыч, В.П. Панюціч, У.І. Пічэта, М.С. Сташкевіч, В.М. Фамін, К.І. Шабуня, З.В. Шыбека, І. Яцкевіч і інш.

На разглядаемай праблеме толькі ў Маскве за апошнія гады абаронены кандыдацкія дысертацыі І.Я. Фаміна, В.А. Дзёміна, І.М. Вяльможка, М.Дз. Постнікава, Ж.Ю. Пушкаровай, А.Дз. Замахава і інш., што сведчыць аб устойлівай цікавасці і навукоўцаў, і грамадскасці да гісторыі Расійскай дарэвалюцыйнай Думы.

Ідэйна-палітычная барацьба ў 1906–1917 гг. у Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай губернях развівалася ў больш складаных умовах, чым у губернях Еўрапейскай Расіі. Гэта было абумоўлена спецыфікай палітыкі ўрада, а таксама класавым, нацыянальным складам насельніцтва рэгіёну, яго гісторыяй. У перыяд выбараў і дзейнасці Расійскай Дзяржаўнай думы I–IV склікання найбольш моцныя пазіцыі мелі партыі і групы манархічнага лагера, якія карысталіся падтрымкай праваслаўнага духавенства і заможнай часткі праваслаўнага беларускага сялянства. Лібералы, прадстаўленыя ў асноўным польскімі і яўрэйскімі групоўкамі, а таксама партыі рэвалюцыйна-дэмакратычнага лагера ўступалі крайне правым па ступені ўплыву на працоўныя масы ў перыяд выбарчых кампаній. У выніку гэтыя партыі цярпелі паражэнні на выбарах, і дэпутацкі корпус ад Беларусі камплектаваўся практычна з рускіх і палякаў. У Думе яны выказвалі гатоўнасць служыць «веры, цару і Айчыне». Сялянскія дэпутаты ад заходніх губерняў, у адрозненне ад рускага сялянства, выступалі за агульнанародную ўласнасць на зямлю і ўраўняльнае землекарыстанне, а не імкнуліся да замацавання зямлі ў асабістую ўласнасць. Польскія «аўтанамісты» патрабавалі, каб ажыццяўленне аграрнай праграмы ў краі было перададзена органам мясцовага самакіравання, у якіх яны разлічвалі гаспадарыць.

Супраць вялікадзяржаўных шавіністаў і польскіх нацыяналістаў, якія вялі барацьбу за сферы ўплыву, іх органаў друку, іх дэпутатаў вялі барацьбу Беларуская сацыялістычная грамада (БСГ) і рэдакцыя газеты «Наша ніва». Некаторыя беларускія даследчыкі не адмяжоўваюць урадавую палітыку ў Беларусі і іншых шматнацыя-

нальных раёнаў і дзейнасцю крайне правых палітычных арганізацый, сродкам дзейнасці якіх было распальванне міжнацыянальнай і міжканфесійнай варожасці. Яна выклікае мерканне, што ўрад не быў зацікаўлены ва ўтварэнні новых ачагоў напружанасці, асабліва ў гады першай расійскай рэвалюцыі. Але спецыфіка выбарчых законаў у Думу адносна заходніх губерняў (утварэнне нацыянальных курый), земская рэформа 1911 г., матэрыяльная падтрымка правых партый і іх органаў друку сведчаць, што царская палітыка ў Беларусі была накіравана на раскол беларускага этнасу па веравызнанні на «рускіх» і «палякаў», а пасля 3 чэрвеня 1907 г. рэзка ўзмацніла дзейнасць, накіраваную на асіміляцыю беларускага народа. І гэта палітыка давала пэўны плён. А калі ў III Думе (студзень 1910 г.) Старшыня Савета міністраў П.А. Сталыпін стварыў Рускую нацыянальную фракцыю, частка дэпутатаў ад Беларусі, у тым ліку і сялянскіх, стала пад яе сцягі. Зразумела, што і ад Думы ў такіх умовах беларускаму працоўнаму люду не прыходзілася чакаць змен у сваім палітычным статусе і эканамічным становішчы. Як з жалем адзначала газета «Наша ніва», у Думу ад Беларусі «не прайшлі сапраўдныя абаронцы справы народнай».

Ад беларускіх губерняў дэпутатамі першага Расійскага парламента сталі 36 прадстаўнікоў. Сярод іх было 13 сялян, 11 інтэлігентаў, 8 памешчыкаў, епіскап, рабін і 2 ксяндзы. З іх 29 прайшлі ў Думу пад кадэцкім сцягам пры падтрымцы Канстытуцыйна-каталіцкай партыі, сіяністаў і «Саюза дасягнення раўнапраўя яўрэяў у Расіі». З сямі астатніх дэпутатаў пяць адносілі сябе да беспартыйных, адзін – да сацыял-дэмакратаў і адзін – да правых.

Безумоўна, саслоўны і партыйны склад пералічаных дэпутатаў не адлюстроўваў рэальнай грамадска-палітычнай сітуацыі ў пяці заходніх губернях, паколькі шэраг уплывовых партый байкатавалі выбары. Беларускія губерні, як і большасць губерняў імперыі, паслалі ў Думу кадэтаў і беспартыйных сялян (якія затым у большасці апынуліся «лявей кадэтаў», у складзе «трудавой групы»). Правыя прайшлі ў выключных выпадках. Вынікі выбараў у І Расійскую думу расчаравалі і напалохалі і органы ўлады, і манархістаў, і лібералаў.

Цэнтральным пытаннем, на якім акцэнтавалі ўвагу дэпутаты, было аграрнае. Кадэты вынеслі свой законапраект за подпісам 42 парламентарыяў. Ён прадугледжваў павелічэнне сялянскага землекарыстання за лік казённых і царкоўных зямель, частковага адчужэння памешчыцкіх зямель з узнагароджаннем уладальнікаў «па справядлівай ацэнцы». Большасць сялянскіх дэпутатаў у І Думе не пайшлі за кадэтамі і стварылі самастойную фракцыю – трудавую групу, у лік

якой увайшлі і восем дэпутатаў ад Беларусі. Трудавікі ўнеслі на разгляд Думы свой зямельны праект – «праект 104-х». Ён прадугледжваў прымусовае адчужэнне памешчыцкіх зямель і стварэнне агульнанароднага зямельнага фонду, у які былі б уключаны ўсе казённыя, кабінецкія, царкоўныя, а таксама прымусова адчужаныя прыватнаўласніцкія землі, што перавышалі працоўную норму. Падрыхтоўку і правядзенне рэформы трудавікі прадугледжвалі перадаць у рукі мясцовых зямельных камітэтаў, выбраных на аснове ўсеагульнага прамога права пры тайным галасаванні. Двое сялян (дэпутаты ад заходніх губерняў М.М. Жукоўскі і М.С. Гатавецкі) выказаліся за прыватную ўласнасць на зямлю.

Эсэры былі супраць прыватнай уласнасці і ў «праекце 33-х» абвясцілі ў якасці першапачатковай задачы адмену прыватнай уласнасці на зямлю, аб'яўленне яе агульнанароднай уласнасцю і перадачу ў распараджэнне мясцовых і цэнтральных органаў самакіравання.

Дэпутаты-памешчыкі Беларусі абаранялі прынцыпы недатыкальнай прыватнай уласнасці і выказаліся за рашэнне аграрнага пытання аўтаномна, ізалявана ад іншых раёнаў імперыі. П.Р. Скірмунт выступіў супраць адчужэння памешчыцкіх зямель, спасылаючыся на тое, што гэта выкліча вялікія выдаткі і неспрыяльна адаб'ецца на становішчы дзяржавы. Памешчык Б.А. Ялавецкі, барон Э.Ю. Роп, ксёндз А.М. Сангайла, падтрымаўшы Р.А. Скірмунта, вырашэнне аграрнага пытання звязвалі з пытаннем аб аўтаноміі Беларусі.

Асцерагаючыся рэвалюцыйнага ўздзеяння думскіх дэбатаў, асабліва па аграрным пытанні, урад распусціў І Дзяржаўную думу, пры гэтым катэгарычна выказаўся за недатыкальнасць прыватнай уласнасці на зямлю.

У ІІ Дзяржаўную думу выбары праводзіліся на аснове ранейшага закону ад 11 снежня 1905 г. У Беларусі значна актывізавалася дзейнасць акцябрыстаў. Больш цесным стала іх супрацоўніцтва з правасоцензамі. У кастрычніку 1906 г. на з'ездзе ў Вільні яны аб'ядналіся ў «Русский окраинный союз» (РОС). Органам друку «акраінікаў» стала газета «Окраины России». Для таго каб прыцягнуць на свой бок беларускае праваслаўнае сялянства і зрабіць яго сваёй надзейнай апорай, члены РОС патрабавалі ад урада паляпшэння яго эканамічнага становішча. Змагаючыся з рэвалюцыяй, яны разам з тым імкнуліся ліквідаваць эканамічнае панаванне і палітычны ўплыў у краі польскіх і спаланізаваных землеўладальнікаў і яўрэйскай буржуазіі. Памешчыкі сумесна з ксяндзом імкнуліся аб'яднаць пад сваім уплывам усё каталіцкае насельніцтва заходніх губерняў, заклікаючы да адзінства на нацыянальнай і рэлігійнай аснове. Актыўную дзейнасць у

[illegible] кірунку [illegible] Вялікім поспехам сярод гарадской яўрэйскай буржуазіі і інтэлігенцыі карысталіся кадэты і пракадэцкі «Саюз для дасягнення раўнапраўя яўрэяў у Расіі». Сярод працоўных актыўную работу праводзілі сацыял-дэмакраты і народніцкія партыі (эсэры, энэсы, БСГ і інш.), якія мелі поспех у сялян. Але калі левыя на выбарах перамагалі, адміністрацыя на месцах і прадстаўнікі манархічных партый дабіваліся адмены вынікаў выбараў.

Акцябрысцка-чарнасоценныя групоўкі ў Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губернях правялі ў Думу 15 дэпутатаў (41,7 %). Колькасць дэпутатаў-кадэтаў, выбраных у беларускіх губернях, скарацілася з чатырох да двух (5,6 %). Восем дэпутатаў абвясцілі сябе беспартыйнымі (22,2 %), а фактычна падтрымлівалі правыя партыі і кадэтаў. З 36 дэпутатаў ад пяці заходніх губерняў землеўладальнікаў-памешчыкаў было 13 (36,1 %), прадстаўнікоў духавенства – 3 (8,3 %), сялян – 16 (44,4%), інтэлігентаў – 4 (11,1 %). У параўнанні з I Думай павялічылася колькасць сялянскіх і памешчыцкіх дэпутатаў за кошт скарачэння прадстаўнікоў ад гараджан.

Разыходжанні ў выніках выбараў у Беларусі і ў краіне ў цэлым часткова тлумачацца тым, што рускім і польскім памешчыкам, прадстаўнікам праваслаўнай царквы і каталіцкага касцёла ўдалося падзяліць беларускую вёску на «рускіх» і «палякаў» і павесці іх за сабой. Асабліва гэта дало свой плён на заключнай стадыі выбараў дэпутатаў Думы.

Галоўным пытаннем у рабоце I і II Дзяржаўнай думы было аграрнае. З урадавай дэкларацыяй і шырокім планам рэформ выступіў Старшыня Савета міністраў П.А. Сталыпін. Урад і памешчыкі абаранялі ўказ ад 9 лістапада 1906 г. (уведзены паміж I і II Думай) аб пераходзе ад абшчыннага сялянскага землекарыстання да асабістага. Акцябрысты Р.А. Лашкароў (Мінская губерня) і І.П. Сазановіч (Магілёўская губерня), абвясціўшы ўсе левыя партыі і левых дэпутатаў ворагамі «рускай дзяржаўнасці», заявілі аб падтрымцы дзеянняў урада. Правыя сяляне ад Беларусі заклікалі «народных прадстаўнікоў» мірна вырашаць пытанні, і ў той жа час усе яны гаварылі аб малазямеллі і прапаноўвалі дадатковае надзяленне сялян зямлёй на правах уласнасці. Асабліва вызначыліся дэпутаты Мінскай губерні А.А. Краскоўскі, В.М. Мельнік, П.Ф. Грудзінскі і прадстаўнік Віцебшчыны І.І. Петрачэнка. Яго прамова ў Думе была класічнай для правых, праваслаўных, заможных сялян. Яна ўключала і веру ў цара, і патрабаванні зямлі, у першую чаргу за кошт польскіх землеўладальнікаў. Правыя сяляне ў катэгарычнай форме выступалі супраць «самакіравання», якое прапаноўвалі польска-беларускія

аўтанамісты. РОС каардынаваў дзеянні і ганарыўся паводзінамі ў Думе правых дэпутатаў і падтрымліваў іх у сваіх органах друку.

Рускія памешчыкі ад заходніх губерняў падтрымлівалі сялянскіх дэпутатаў у імкненні вырашыць аграрнае пытанне часткова за кошт польскіх памешчыкаў і прапаноўвалі іншыя шляхі, якія заключаліся ў паляпшэнні апрацоўкі зямлі, у асваенні балоцістых, пясчаных ды іншых тэрыторый.

У другой палове 1907 г. адносіны да выбарчай кампаніі ў III Думу былі ў цэнтры ўвагі ўсіх палітычных сіл і партый Расіі. Асаблівую актыўнасць праяўляў «Саюз рускага народа» (СРН). Яго сталічнымі лідэрамі быў распрацаваны праект выбарчай платформы для манархічных груповак Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай, Ковенскай губерняў і Царства Польскага, у якім былі патрабаванні весці ўзмоцненую барацьбу з палякамі, што «пагражаюць узброеным паўстаннем», і яўрэямі. Саюзнікамі для мясцовых груповак СРН у ходзе выбарчай кампаніі былі вызначаны праваслаўныя брацтвы. З манархічнымі партыямі ў заходніх губернях аб'яднаўся «Саюз 17 кастрычніка». Узнік «Рускі ўскраінны саюз» (РУС), які меў мэтай падтрымку самаўладдзя, процістаянне рэвалюцыйнаму руху, абарону прынцыпаў прыватнай уласнасці і праваслаўя. Значную ролю ў аб'яднанні правых сіл адыгрывалі іерархі праваслаўнай царквы і асабліва архіепіскап Мінскі і Тураўскі Міхаіл.

У цэлым у Думу прайшло 36 дэпутатаў. З іх памешчыкаў – 12 (33,3 %), прадстаўнікоў праваслаўнага духавенства – 7 (19,3 %), каталіцкага – 1 (2,9 %), чыноўнікаў – 5 (14 %), сялян – 11 (30,5 %). Большасць дэпутатаў была прадстаўлена памешчыкамі і духавенствам – 20 (56 %).

Такім чынам, 4 тыс. памешчыкаў выбралі 12 дэпутатаў, а 146 тыс. сялян, якія мелі права ўдзельнічаць у выбарах, – 11. У памешчыкаў адзін дэпутат прыпадаў на 333 землеўладальнікі, а ў сялян – на 13 272 домаўласнікі.

Адно з цэнтральных месцаў у рабоце Думы заняло аграрнае пытанне. Пры абмеркаванні ўказа ад 9 лістапада 1906 г. ад фракцыі правых з яго падтрымкай выступіў епіскап Гомельскі Мітрафан (Д.І. Краснапольскі) і протаіерэй Ф.І. Ніканові́ч (Віцебская губерня). Н.К. Тычынін (Гродзенская губерня) прапанаваў пачаць асваенне новых зямель у Заходняй Сібіры, Туркестане, Закаўказзі, а таксама заняцца акультываваннем балоцістых, пясчаных, нарэзаных ярамі зямель. Польска-літоўска-беларуская група выступала за ліквідацыю абшчыннага землеўладання.

Да правых і акцябрыстаў далучыліся прагрэсісты. Аднак адзіны прагрэсіст ад заходніх губерняў В.А. Біч (Гродзенская губерня)

імкнуўся [illegible] інтарэсы беларускага [illegible], паколькі адступіў ад пазіцый сваёй партыі па аграрным пытанні. [illegible] ўласныя падлікі, ён паказаў, што ўрадавыя меры не змогуць палепшыць становішча сялян. В.А. Біч прапанаваў рэарганізаваць мясцовае кіраванне Паўночна-Заходняга краю: ліквідаваць надзвычайнае становішча і ўвесці земскае самакіраванне з «дастатковымі паўнамоцтвамі ў гаспадарчай і культурнай сферы».

У IV Думу ад пяці заходніх губерняў было выбрана 36 дэпутатаў. З іх памешчыкаў – 13, прадстаўнікоў праваслаўнага духавенства – 5, каталіцкага – 1, чыноўнікаў – 7, сялян – 10. У параўнанні з III Думай павялічылася колькасць памешчыкаў і чыноўнікаў за кошт скарачэння прадстаўнікоў ад праваслаўнага духавенства і сялянства.

Па партыйным складзе дэпутаты ад заходніх губерняў у IV Думе амаль не адрозніваліся ад дэпутатаў III Думы. Калі ў III Думе да крайне правых адносіліся 25 дэпутатаў, акцябрыстаў – 4, прагрэсістаў – 1 і Краёвай партыі Літвы і Беларусі – 6, то ў IV – правых і расійскіх нацыяналістаў было 27, акцябрыстаў – 3, прагрэсістаў – 1, краёўцаў – 5.

Неабходны для ўрада партыйны склад дэпутатаў у IV Думу ад заходніх губерняў быў дасягнуты мясцовай адміністрацыяй, вышэйшымі ўладамі, партыямі правых і нацыяналістаў у саюзе з праваслаўным духавенствам пры дапамозе не толькі закона ад 3 чэрвеня 1907 г., але і розных парушэнняў у час выбараў на ўсіх стадыях (пагрозы, арышты, высылкі, устраненне ад выбараў, перанос выбараў у нязручныя для большасці выбаршчыкаў месцы, ці назначэнні іх у нязручны час і г. д.). Аб гэтых фактах сведчылі скаргі, якія ішлі з усіх губерняў у Дзяржаўную думу.

Лёс расійскага парламентарызму вырашаўся не толькі ў самой Думе. Шмат чаго залежала ад практычных установак палітычных партый, іх практычнай дзейнасці, рэакцыі грамадства на тое, што адбывалася ў Думе і вакол яе, палітыкі самадзяржаўя. У канцы 1912 г. урад знаходзіўся ў складаным унутрыпалітычным і міжнародным становішчы. Прадстаўнікі фракцыі правых абвінавачвалі яго ў адсутнасці праграмы дзеянняў, падкрэслівалі, што шлях думскага і канстытуцыйнага развіцця прывядзе да гібелі манархіі. Дэпутаты Г.Г. Замыслоўскі (Віленская губерня), К.М. Акаловіч (Мінская губерня) і іншыя заклікалі ўрад да рашучых дзеянняў супраць палякаў і яўрэяў у Заходнім краі.

Распачатая Першая сусветная вайна садзейнічала яднанню пазіцый featuring розных палітычных сіл

Утварэнні і дзейнасці Прагрэсіўнага блока, у які ўвайшоў і дэпутат ад Беларусі Ф.І. Лашкейт. У заходніх губернях правы друк, у прыватнасці газеты «Виленский вестник», «Северо-западная жизнь», рэзка выступілі супраць створанага ў Думе блока, абвінавачваючы яго ў пашырэнні правоў для яўрэйскага насельніцтва.

Расійская Імперыя на цэлае стагоддзе спазнілася з рэформамі, што стварыла мноства палітычных і сацыяльных праблем. Спробы вырашыць адну з іх сутыкаліся з нявырашанасцю астатніх. Расійскі лібералізм праявіў сваю слабасць, ён не змог схіліць царызм да канстытуцыйнай эвалюцыі краіны.

© Забаўскі М.М., 2007

*Т.Г. Тиковенко, Л.А. Киселева*

## МАНИФЕСТ 17 ОКТЯБРЯ 1905 г. В КОНТЕКСТЕ РОССИЙСКОЙ ВЕКОВОЙ ТРАДИЦИИ

По мнению большинства известных русских государствоведов, историков, политиков, Манифест 17 октября заложил конституционные основы российской государственности. П.Б. Струве считал, что этот документ явился краеугольным камнем «нового государственного строя России», благодаря ему «родилась русская свобода, создан русский гражданин» [1, с. 15]. Современный исследователь в области истории конституционализма И.А. Кравец отмечает, что великое значение этого государственного акта заключалось как в определении направления и хода течения конституционной истории России, так и в провозглашении политических свобод, не существовавших в прежней России. Если манифест 19 февраля 1861 года отменил на просторах Российской империи гражданское рабство, то манифест 17 октября 1905 года отменил рабство политическое» [2, с. 81, 87]. Конституционные положения Манифеста 17 октября свидетельствовали о качественной кристаллизации общественного сознания не только различных представителей политической мысли, но и ближайшего окружения Николая II. Например, К.П. Победоносцев, выступая на совещании во время вступления на престол Александра III, сказал следующее: «В России хотят ввести Конституцию… А что такое Конституция? Ответ нам на этот вопрос дает Западная Европа. Конституция, там существующая, есть орудие всякой неправды, источник всякой интриги» [3, с. 54].